# ЧАЛАВЕК ВА ЎМОВАХ КАТАКЛІЗМАЎ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ТВОРЧАСЦІ ЯРАМІРА НАГАВІЦЫ)

**І. Паплёўка**

Чалавек на мяжы стагоддзяў – асабліва цікавая тэма для пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў, музыкаў. Падсумаванне вынікаў мінулага, надзеі на будучыню – усё гэта здольна змяніць свядомасць чалавека, часам нават незаўважна для яго самога. У дадзеным выпадку гаворка ідзе пра памежжа XX і XXI стст. – час вельмі калізійны і незвычайна цікавы для асэнсавання.

З`яўляліся розныя гіпотэзы наконт таго, як грамадства перажыве гэты час, асабліва часта выказвалася меркаванне пра канец свету, бо гісторыя – гэта цыклічны працэс, у якім заўжды можна заўважыць пэўныя заканамернасці. Таму чалавек і баіцца. Асабліва актуалізуецца страх напрыканцы цэлага тысячагоддзя, калі чалавек больш засяроджаны ў чаканні далейшага лёсу, адсюль і высновы, што гэты час можна лічыць катаклізмамі ў жыцці грамадства.

Аб´ект нашай увагі – тэксты песен Яраміра Нагавіцы, знакамітага барда Чэхіі канца XX-пач.XXI стст. – чалавека, які ў сваёй творчасці досыць align рознабакова адлюстраваў жыццё свайго народа, здолеў прасачыць эвалюцыю свядомасці сваіх суайчыннікаў. Тэма актуальная і запатрабаваная, што тлумачыцца вялікай папулярнасцю Нагавіцы, а таксама тым, што даследаваннямі яго творчасці дагэтуль займаліся пераважна культуролагі, тэксты ж – прадмет літаратуразнаўства – разглядалі пераважна ў адзінстве з музыкай (варта прыгадаць працы Томаша Палачка, Іржы Чэрнага, Дануты Сіес-Кжышкоўскай (Польшча), Марка Цыбульскага (ЗША), Даніэля Соўкупа) мы ж паспрабуем прааналізаваць іх асобна.

Мэта нашай працы – адлюстраваць адметнасці свядомасці чэхаў у дадзеную эпоху. Задачы: прасачыць узаемадзеянне чалавека і грамадства, прааналізаваць найбольш актуальныя тэмы творчасці. Менавіта Я. Нагавіца быў узяты за прыклад, на наш выбар паўплывалі высока мастацкія тэксты, якія нічым не саступаюць традыцыйным вершам, маштабнасць яго творчасці як у храналагічных, так і ў тэматычных межах, знакамітасць, пра што сведчыць яго высокае месца ў агульначэшскім апытанні «Самы вядомы чэх».

Першая тэма, на якой бы хацелася спыніцца – узаемаадносіны чалавека і грамадства. Чалавек не давярае нікому, ён сам у сабе, вымушаны шукаць сваё асабістае «Я», каб людзі не заўважылі, што насамрэч ён не такі, як усе.

*Já prostě odcházím jen – я проста адыходжу;*

*bránit své horizonty – бараніць свае гарызонты;*
*bránit svůj kousek země – бараніць свой кавалак зямлі;*
*čtvrt čtverečního metru – чвэрць квадратнага метра..*

Лірычны герой баіцца прайграць, ён заклікае перажываць за яго, але галоўная небяспека хаваецца ў невядомасці, у пытанні: хтопраціўнік? Чалавек баіцца, ён ідзе на меч з мячом, добра разумеючы бессэнсоўнасць гэтага пахода. Над чалавекам – хмары, ён пытаецца ў людзей, чаму яго не любяць. Лірычны герой шукае любові, але расчароўваецца ў гэтых пошуках. Адсюль і словы «moje srdce smutné srdce» («маё сэрца – смутнае сэрца»). Пакуль не асэнсоўваючы паражэння, чалавек не адчувае ў сабе моцы для супрацьстаяння абставінам і грамадству. Людзей ён лічыць ворагамі, абсалютна іх не дыферэнцыруючы. У наступным тэксце «*Na jedné lodi plujem*» («*На адной лодцы плывем*») перад вачамі паўстае досыць цікавая карціна. На лодцы плывуць людзі, не ведаючы куды. Часам яны адкладаюць вёслы, проста аддаючыся ў рукі цячэння і ветра. На лодцы – хаос: капітан заўжды напіваецца ромам, а над тымі, хто яшчэ жывы, жахліва звісае пятля: *Na jedné lodi plujem// na jedné palubě// a i když neveslujem// voda nás sama nese.*

У тэксце «*Blues o malých bytech*»(«*Блюз пра малыя кватэры*») на першы план выходзіць сацыяльная тэма – складанасці пры выездзе за мяжу, новыя няўтульныя кватэры, бюракратызм. Рэчаіснасць мае яшчэ адну адметнасць – «je stále těžší těžší je stále těžší mít diplom v kapse a být si jist že budeš jíst»(«усё больш складана мець дыплом у кішэні і быць упэўненым, што зможаш сябе пракарміць»).

Падводзячы пэўную рысу пад усім, што было сказана, проста акрэсліць агульны настрой тэкстаў на дадзеную тэму – скепсіс і песімізм, якія часам мяжуюць з адчаем і няўпэўненасцю ў сабе. Пра многае гавораць і назвы: «*Moje malá válka*» («*Мая малая вайна*»), «*Moje smutné srdce*» («*Маё смутнае сэрца*»), «*Darmoděj*» («*Дармадзей*»)… Значнае месца у творчасці Я. Нагавіцы займае тэма мінулага. Чалавек асэнсоўвае свой уласны лёс, спрабуе штосьці прааналізаваць, знайсці нейкія памылкі. Часта ён аналізуе сябе адарвана ад іншых, не ўлічвае развіцця грамадства. Так, у тэксце «*Třiatřicet*» («*Трыццаць тры*») падводзіць рысу пад тым, што было зроблена, і прыходзіць да несуцяшальнай высновы. У іранічнай форме аўтар расказвае пра боль у касцях, вялікі жывот, абыякавасць дзяўчат да сваёй персоны. Так ці інакш, але тэкст прасякнуты настальгіяй. Гэта нельга назваць расчараванасцю, але, як і ў кожным іранічным творы, варта зазірнуць крыху глыбей у сябе. Магчыма, пад такой вопраткай і хаваецца пэўная незадаволенасць лірычнага героя сваім сучасным становішчам. Маўляў, наблізіўся да ўзросту Хрыста, а ўсё яш-

чэ працягваю займацца бязглуздзіцай. У наступным тэксце «*Život*» («*Жыццё*») аўтар праяўляе сябе з іншага боку, падыходзіць да асэнсавання сутнасці жыцця з філасофскай пазіцыі. Падбіраючы найбольш трапнае вызначэнне жыцця, ён сам губляецца ў сваіх роздумах. Жыццё для яго – гэта і міннае поле, і шэраг звязаных паміж сабой нітак… У любым выпадку, гэта нешта складанае, што цяжка ахарактарызаваць. Як-ніяк тысячы дарог вядуць у розныя бакі, і дзякуй Богу, калі чалавек знойдзе хоць нейкую для сябе. Безумоўна, у лірычнага героя прысутнічае страх, бо ад яго выбару многае залежыць: чалавек баіцца адказнасці, баіцца зрабіць свой уласны выбар, баіцца будучыні, баіцца шкадаваць. Адным словам, ён проста баіцца сябе. Не зразумеўшы сваёй ролі ў грамадстве, даволі складана зрабіць нейкі адназначны выбар. «Není co není jak není proč není kam není s kým není o čem každý je v sobě sám» («Няма што, невядома як, невядома куды, няма з кім, няма пра што, кожны сам у сабе») – вось радкі, якія трапна характарызуюць стан асобы. Часам Ярамір Нагавіца спрабуе знайсці вінаватых, у лік якіх трапляе і Бог, якога лірычны герой называе сляпым кіроўцам. Любоў змянілася на нянавісць – чалавек закрываецца ў сабе. Звычайна ў такіх выпадках чалавек вінаваціць уладу, што, канешне ж, ёсць і ў Нагавіцы. Нелюбоў да СССР, якая часам пералівалася ў злосць, вызначае тагачасную творчасць чэхаў. Пасля абвяшчэння Чэшскай Рэспублікі сітуацыя змянілася ў іншы бок. У песні «*Pane Prezidente*» («*Пан прэзідэнт*») відавочны давер лірычнага героя да прэзідэнта свайго народа – Вацлава Гавэла. Лірычны герой узгадвае нядаўнія рэвалюцыйныя падзеі ў Чэхіі, але ж, як ні дзіўна, песімізм прысутнічае і тут. З паляпшэннем становішча краіны, чалавек усё адно пакутуе: на яго забыліся дзеці, ён адчувае сябе адзінокім. Зрабіўшы нешта для сваёй Радзімы, ён хоча, каб і Радзіма зрабіла штосьці для яго.

Vy to pochopíte – вы гэта зразумееце;
vy se mnou soucítíte – вы мне паспачуваеце;
vy se poradíte vy to vyřešíte – вы дадзіце параду вы гэта вырашыце;
vy mě zachráníte – вы мяне абароніце;
pane prezidente – пан прэзідэнт;
já chci jen kousek štěstí – я хачу толькі кавадак шчасця;
pro co jiného jsme přeci zvonili – дзеля чаго іншага мы званілі;
klíčema na náměstí – ключамі на плошчы.

Важнае месца займае таксама тэма свабоды. Прытым у сваёй большасці маецца на ўвазе асабістая свабода чалавека, свабода ад пэўных запаветаў. Часам чалавек адкрываецца, але, як вынікае з тэксту «Dopisy bez podpisu» («Лісты без подпісу»), потым пакутуе ад гэтага. Адчыніўшы дзверы для сваіх сяброў, ён сустрэў злодзеяў. Зняўшы з вакон жалюзі, ён

ведае, што гэты ўчынак абернецца для яго нечым благім. Чым жа ў такім выпадку кіруецца герой?

Nestůjte ke mně zády – не стойце да мяне спінаю;
já chci vás vidět čelem – я хачу бачыць вас у твар;
jak znám své kamarády – як ведаю сваіх сяброў;
jak znám své kamarády – як ведаю сваіх сяброў;
chci znát i nepřátele – як ведаю сваіх сяброў;

Часам лірычны герой апынаецца ў незнаёмым месцы, у незнаёмым горадзе, у ролі якога выступіў Вавілон. У новым месцы чалавеку ўсё здаецца новым, прытым ён не прымае новых парадкаў, лічачы іх чужымі. Ён называе сябе дзіцём, якое страціла маці, птушкай, якая выпала з гнязда. Адзіная яго мэта – знайсці крылы і паляцяцець як мага далей ад усіх. Праўда, пачынаючы вандраваць, чалавек рызыкуе стаць бедным і непатрэбным. «Jdou po mně jdou na každým rohu mají fotku mou» («ідуць, за мной ідуць, на кожным вуглу маё фота») – чалавек жыве з думкай пра нейкага нябачнага ворага, з марай нарэшце пабачыць яго. Герой ніколі не змірыцца з думкай пра выдуманыя страхі, ён адчувае небяспеку, і схавацца становіцца яго галоўнай мэтай. Прытым у якім бы штаце якой бы краіны чалавек не знаходзіўся, вораг застаецца нязменным: ён заўсёды побач, і ў любы час можа павярнуцца тварам.

Такім чынам нам удалося на матэрыяле творчасці Яраміра Нагавіцы прааналізаваць найбольш вызначальныя адметнасці псіхалогіі чэхаў на дадзеным этапе іх развіцця, што і ставілася за асноўную мэту працы. Усе гэтыя адметнасці і былі названыя вышэй, таксама былі разгледжаныя больш вузкія пытанні ўзаемаадносін чалавека і грамадства, асабістай свабоды чалавека. Намі былі таксама вылучаныя тэмы, якія хвалявалі аўтара, дзякуючы чаму ўсе тэксты размеркаваныя па розных групах і даюць сістэматычнае ўяўленне дадзенай праблемы.

## МЕНТАЛІТЭТ БЕЛАРУСАЎ І АНГЛІЧАН ПРАЗ ПРЫЗМУ ПАРЭМІЯЛОГІІ

**А. Я. Пыж**

Вядома, што мова як адна з найбольш характэрных складовых нацыянальнай культуры, адлюстроўвае і выражае і агульначалавечыя, і нацыянальна-спецыфічныя асаблівасці культуры народа. Таму ў беларускай моўнай карціны свету мы ўзялі ідыёмы найбольш частыя ў маўленні, якія здольныя скласці малымі сродкамі яркую шматвобразную мазаіку. Мы прапануем наступную тэматычную класіфікацыю **беларускіх** нацыянальных канцэптаў:

ЧАЛАВЕК – *хоць малы, але вялікаму лапці падпляце.*